ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 100 (1369) ПАНЯДЗЕЛАК, 4-га мая 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

9 мая антысэміты з заводу Ізаліт № 2 прадстануць перад пролетарскім судом

Скончана сьледзтва па справе аб зьдзеках антысэмітаў над рабочым-ударнікам тав. Нявельскім на тарпяным заводзе Ізаліт № 2 (ст. Татарка). Справу пачынае слухаць выязная сэсія Вярхоўнага суда. У якасьці грамадзкіх абвінаваўцаў дапушчаны прадстаўнікі ЦП саюзу тарп. і сланц. прамысловасьці і рэдакцыі газэты „Рабочий“.

Першае Мая за рубяжом

Адзіны фронт пролетарыяту—за сусьветны Кастрычнік

У абарону СССР—мільёны пролетараў буржуазных краін вышлі на дэмонстрацыі

Паліцыя ператварае гарады падобныя на вайсковыя лягеры

XI міжнародны

З першага мая сусьветная піонэрорганізацыя і яе авангард—піонэры СССР—сьвяткуюць у XI раз міжнародны дзіцячы тыдзень.

Сьвяткаваньне гэтага вялізарнейшага сьвята пролетарскай дзетвары праходзіць ва ўмовах жорсткага экономічнага крызісу ў капіталістычных краінах і магутнага, нябачанага росту соцыялізму ў СССР.

Сусьветны крызіс, які ахапіў усе галіны вытворчасьці, кладзецца цяжкім бярэмем ня толькі на сьпіны дарослых рабочых, але і на членаў іх сямей і ў значнай меры на дзяцей.

У „цывілізаванай“ Амэрыцы каля 10 мільёнаў дзетвары жывуць у прагаладзь. У розных акругах Бэрліну зусім спынена выдача сродкаў на дзіцячае харчаваньне. У адным толькі Бэрліне каля 55 тысяч галадаючых дзяцей.

А колькі іх, галодных і паўгалодных дзяцей, у іншых „цывілізаваных“ краінах, у калёніях і паўкалёніях?

Дзіцячая праца, гэта дармовая фізычная сіла, дае вялізарныя прыбыткі сусьветнаму капіталізму. У Кітаі каля 3 мільёнаў дзяцей жорстка эксплёатуюцца магнатамі розных галін прамысловасьці. Па прыблізных падліках, у адным толькі Шанхаі каля 200 тысяч дзяцей працуюць на прадпрыемствах.

У параўнаньні з агульнай колькасьцю рабочых, занятых у індустрыі Шанхаю, каля аднэй чверткі—дзеці. У большасьці дзеці працуюць на тэкстыльных, шоўкавых і тытунёвых фабрыках—шкоднейшых для дзіцячага організму.

Рабочы дзень 9-ці—15-ці гадовага падлетка даходзіць да 12-14 гадзін, а заработная плата толькі 1 з пал. даляра ў месяц.

Такія-ж малюнкі жорсткай эксплёатацыі дзіцячай працы і ў іншых краінах.

XI-ты МТД, які праводзіцца за мяжамі з 1-га па 14-е мая, а ў нас, у СССР,—з 2-га па 9-ае, павінен зьявіцца баявым аглядам сіл пролетарскай дзетвары ў іх барацьбе, сумесна з сваімі бацькамі і братамі пад кіраўніцтвам партыі, з капіталізмам. Для дзяцей СССР XI МДТ—будзе тыднем, калі ўся працоўная дзетвара праверыць свой удзел у соцыялістычным будаўніцтве, у барацьбе за пяцігодку ў чатыры гады, разгортваньне і ўмацаваньне інтэрнацыянальнага выхаваньня.

Пролетарская дзетвара за мяжою ў гэтыя тыдні выступіць на барацьбу супроць беспрацоўя, зьніжэньня заработнай платы бацьком, супроць падрыхтоўкі інтэрвэнцыі ў Савецкі Саюз.

Піонэры СССР за гэты тыдзень падлічаць вынікі сваёй дапамогі комсамолу і партыі ў барацьбе на гаспадарчых перакопах.

У міжнародны дзіцячы тыдзень піонэрская організацыя Савецкага Саюзу павінна выканаць баявую задачу, якую паставіў перад ёю 9-ты зьезд УсеЛКСМ: „уцягнуць у свае рады ўсіх пролетарскіх дзяцей“.

Піонэрскія організацыі павінны яшчэ больш разгарнуць інтэрнацыянальную сувязь. Яшчэ больш разгарнуць работу па ўцягненьню ўсіх школьнікаў у ячэйкі юных прыхільнікаў МОПР'у.

Як ніколі пролетарская дзетвара павінна ведаць аб прычынах шалёнай падрыхтоўкі вайны і быць гатовай да абароны бацькаўшчыны сусьветнага пролетарыяту—СССР.

Міністры сьпяшаюць забараніць


ВЕНА. Як паведамляюць з Софіі, баўгарскі міністар унутраных спраў забараніў наладжваць 1 мая якія-б там ні было рабочыя дэмонстрацыі. Западазроныя ў вуснай ці пісьмовай агітацыі за сьвяткаваньне 1 мая будуць асуджаны на падставе закону аб „ахове дзяржавы“.

Баўгарская паліцыя конфіскавала звыш 300.000 адозваў рэволюцыйнага камітэту па наладжваньню 1 мая.

Атрад паліцыі адкрыў страляніну

ВАРШАВА 1. У Любартаве (Люблінскае ваяводзтва) 1 мая рэволюцыйная сялянская організацыя організавала мітынг у якім удзельнічала больш 500 чалавек. Пасьля мітынгу адбылася дэмонстрацыя. Атрад паліцыі спрабаваў разагнаць дэмонстрацыю, але быў разброены сялянамі. Другі атрад паліцыі, што прыбыў на падмацаваньне, акрыў страляніну з вінтовак, забіў двух сялян і некалькі цяжка параніў. Адказнымі стрэламі з боку сялян цяжка паранена двое паліцэйскіх.

Намаганьнямі паліцыі мітынг быў разагнаны.



Из здымку: Аўстрыйская дэлегацыя на „Чырвонай плошчы“ ля маўзолею Леніна.

Штыхі і сьлёзатачывыя бомбы супроць дэмонстрантаў

ВАРШАВА. 1, Горад з раніцы стаў падобны на ўзброены паліцэйскі лягер. На ўсіх буйных пляцох сконцэнтраваны значныя атрады паліцэйскіх вучасткаў са сталёвымі штыхамі, з бомбамі, што выклікаюць сьлёзацячэньне і новымі гумовымі дубцамі. Трамвайны і аўтобусны рух у горадзе спынены. Бяздзейнічае большасьць прадпрыемстваў, у тым ліку ваенны завод „Попіск“ (звыш тысячы рабочых), дзяржаўны тэлефонны завод, тытунёвая фабрыка, галоўныя чыгуначныя майстэрні і г. д.

Уноч на сёньня на ўсіх дарогах расстаўлена паліцэйская варта. Па распараджэньню паліцэйскае ўлады пільнавалі дворнікі, каб перашкодзіць рэволюцыйным рабочым раськлейваць адозвы. Каб не дапусьціць „комуністычных эксцэсаў“, маршруты дэмонстрацый пастаўлены паліцыяй такім чынам, каб узаемна не перасякаць. Напярэдадні ўвесь буржуазны друк зьмяшчаў правакацыйныя вымыслы быццам ў першамайскіх праклямацыях компартыі „ёсьць заклік да праліцьця крыві“ і г. д.

Дэмонстрацыі, якія адбыліся ў Варшаве сьведчаць аб рэволюцыянізаваньні рабочае клясы і аб бясспрэчным росьце ўплыву компартыі. Дэмонстрацыя пэпээсаўцаў сабрала нават па падліках саміх пэпээсаўцаў, ня больш 2—3 тысяч чалавек. Лёзунгі пэпээсаўскай дэмонстрацыі, ня гледзячы на асобныя левыя патрабаваньні, гаварылі не аб рэволюцыйнай барацьбе пролетарыяту, а аб аднаўленьні самакіраваньня бальнічным касам, дапамог на старасьць, права на работу і г. д.

Далучыўшыся да пэпээсаўскай дэмонстрацыі, калёны бундаўцаў і „Поалей-цыон“, сумесна склалі дэмонстрацыю ў 4—5 тысяч чалавек.

Пачынаючы з раніцы, у рабочых прадмесьцях Варшавы пачалі зьбірацца па закліку компартыі групы рабочых. Баявая дружына яваршчыкаў адкрыла стральбу па комуністычнай дэмонстрацыі у 2.0 чалавек. У выніку перастрэлкі паранена некалькі чалавек, у тым ліку і паліцэйскі. Каля ф-кі „Паравоз“ яваршчыкі спрабалі перашкодзіць комуністычнаму шэсьцю ў 300 чалавек. У выніку сутычкі завязалася перастрэлка, у якой з абодвых бакоў паранена некалькі чалавек. На вуліцы Нізкай нават па паведамленьню вячэрняга ўрадавага друку, сабралася звыш тысячы комуністых з рэволюцыйнымі транспарантамі і лёзунгамі. Дэмонстрацыя была разагнана моцным атрадам паліцыі.

Комуністычныя дэмонстрацыі працягваюцца і па сучасны момант. Агульны лік дэмонстраваўшых пад сьцягамі компартыі, калі ўлічыць разгон той ці іншай дэмонстрацыі, а яна зноўзьбіралася ў іншым месцы, можна вызначыць ад 5 тысяч да 7 тысяч чалавек.

„Падарунак“ к 1-му мая...

ВАРШАВА. Па паведамленьню друку, міністэрства ўнутраных спраў у бліжэйшыя дні разашле органам мясцовага кіраўніцтва і ваяводам абежнік, у якім запрапануе зьнізіць к 1 мая аклады служачым і зарплату рабочым на 15 проц.

Люстгартэн і прымежныя вуліцы ўяўлялі сабою мора чырвоных сьцягаў

БЭРЛІН, 1. Першамайскае выступленьне бэрлінскага рэволюцыйнага пролетарыяту вылілася ў грандыёзную рэволюцыйную дэмонстрацыю. Па самых асьцярожных падліках у організаванай компартыяй дэмонстрацыі прымала ўдзел каля 200 тысяч чалавек. Аграмадныя масы дэмонстрантаў запоўнілі ня толькі ўвесь Люстгартэн, але і ўсе вуліцы якія прылягаюць к пляцу.

Пасьля таго, як пачаўся мітынг з раёнаў усё яшчэ прыбывалі доўгія калёны дэмонстрантаў. Масы зьбіраліся у 50 пунктах гораду і потым з 7-мі цэнтральных зборных пунктаў доўгімі калёнамі накіраваліся к Люстгартэну, Калёны ішлі некалькі гадзін. Вулічны рух быў спынены. Дэмонтранты поўныя рэволюцыйнага энтузіязму ішлі сьпяваючы рэволюцыйныя песьні, з оркестрамі. Асабліва кідаўся у вочы масавы ўдзел заводзкіх рабочых і груп рэволюцыйнай профопозыцыі.


Шчыльныя калёны рабочых сотцен заводаў ішлі з заводзкімі сьцягамі і рэволюцыйнымі лёзунгамі. Надзвычайна сільна быў прадстаўлены рэволюцыйны профсаюз мэталістых Бэрліна, а таксама профсаюз будаўнічых рабочых. Комсамол і рэволюцыйныя партыйныя організацыі значна выдзяляліся колькасьцю сваіх калён. Організацыя МОПР'у, міжрабпому і міжнароднага саюзу ахвяр вайны і працы былі прадстаўлены буйнымі калёнамі. Люстгартэн і ўсе прымежныя вуліцы ўяўлялі сабой мора чырвоных сьцягаў і транспарантаў. Найбольш часта на транспарантах віднеліся лёзунгі: „За працу і хлеб“ „За 40 гадзіны рабочы тыдзень без скарочаньня зарплаты“. „Мы змагаемся за савецкую Нямеччыну“, „Усе на абарону Савецкага Саюзу“ і г. д.

Першамайская забастоўка ў Шанхаі

ШАНХАЙ. 1. Яшчэ 30 красавіка ў Шанхаі быў абвешчаны стан асады у якасьці меры для папярэджаньня палітычных хваляваньняў у дзень першага мая. Вялікія атрады паліцыі і войск ахоўваюць горад у асаблівасьці галоўную вуліцу—Нанкін-Род.

Выхады чужаземных концэсій у кітайскія кварталы гораду, а таксама ў некаторыя раёны паміж францускай концэсіяй і міжнародным Сэтльмэнтам абкружаны калючым дротам. Дэмонстрацыі забаронены.

Наперакор надзвычайнаму палітычнаму тэрору, сёньня ў Шанхаі абвясьцілі першамайскую забастоўку каля 100 тысяч рабочых. У горадзе распаўсюджвалася вялікая колькасьць рэволюцыйных лістовак.



Гутаркі з рабочымі аб Першым Мая і другой гадавіне соцспаборніцтва ў сьлясарна-зборачным цэху заводу „Комунар“.

Аэроплян „ахоўваў парадак“

ПАРЫЖ. 1. Горад набыў 1 мая нязвычайны выгляд. Вулічны рух надта скараціўся, бо многія тысячы шофэраў абвясьцілі першамайскую забастоўку. Бастуюць таксама будаўнічыя рабочыя і грабары. У стратэгічных пунктах Парыжа, на пляцох, бульварах, вакол заводаў разьмешчаны атрады паліцыі і коннай гвардыі, а таксама воінскія часткі, спэцыяльна выкліканыя з провінцыі. Над горадам лётае паліцэйскі аэроплян, які зносіцца па радыё з паліцэйскімі пастамі.

Воінскія часткі, сконцэнтраваныя ў казармах, аддадзены у распараджэньне прэфэктуры і паліцыі.

Орган францускай компартыі „Юманітэ“ вышаў 1 мая ў скарочаным намеры і з прабеламі, на якіх адзначана, што гэтыя радкі выпацканы цэнзурай. „Юманітэ“ паведамляе, што ўчора быў конфіскаваны першамайскі нумар газэты па тых мотывах, што ён зьмяшчаў заклікі да забастовак. „Юманітэ“ адзначае, што да конфіскацыі ўдалося распаўсюдзіць шмат дзесяткаў тысяч экзэмпляраў кофіскаванага нумару.

У рабочых прадмесьцях Клішы, у прадмесьці Сэн-Дэні, на трамвайных правадох і ў іншых мала даступных мясцох былі вывешаны транспаранты з першамайскімі заклікам .

А 6 гадзіне ўвечары на паўночным вакзале адбываўся лятучы мітынг, на якім было распаўсюджана шмат экзэмпляраў „Юманітэ“. Зроблена шмат арыштаў. За распаўсюджваньне лятучак, заклікаючых к першамайскім дэмонстрацыям, учора арыштавана некалькі дзесяткаў рабочых. Арыштаваны таксама сэкратар парыскага абласнога камітэту ўнітарнага (рэволюцыйнага) профсаюзу чыгуначнікаў і сэкратар унітарнага профсаюзу шофэраў.

Пад выглядам служачых у Рызе знаходзіцца 60 ангельскіх афіцэраў

РЫГА. Амаль увесь латвійскі друк публікуе паведамленьне Бэрлінскай газэты „Гэмно“ аб прабываньні ў Рызе, пад відам служачых розных фірм, 60 ангельскіх афіцэраў, прыехаўшых з мэтай „вывучыць расійскую мову і пазнаёміцца з умовамі, існуючымі ў Усходняй Эўропе! Аднача сова газэты публікуюць абвяржэньне ангельскага ваеннага аташэ, заяўляючага, што „паведамленьне бэрлінскай газэты не адпавядае сапраўднасьці“. Па зьвестках з асьведамлёных кругоў паведамленьне аб прабываньні ў Рызе ангельскіх афіцэраў пад выглядам служачых разнастайных фірм, адпавядае сапраўднасьці.

Літаратурная старонка

Завод.

Якуб Ермаловіч

Крычыць аўто
І вежы горда
Усталі з цемені густой.

Як сотні труб,
Адным акордам
Гудкі прарэзалі простор.

І ў гуле рокатным няўтомна
Кішаў рабочымі квартал,
Іх зваў завод,
Каб зноўку домны
З руды высмоктвалі мэталь.

Натхненьня творчага заўзята
У ваганьні жыл і ў грудзёх
З іх кожны нёс
Маленькі атам
Уліць у кроў
Будоўлі дзён.

Руку,
Таварыш мой,—рабочы!
Мы плавім сталь,
Мацуем дні,
Две век электрыкі ўжо крочыць,
Комун успыхваюць агні.

Я ведаю,
Што ты, завод мой,
Выхоўваў сілы барыкад
І першы сьцяг
За пяцігодку
Тут быў ударнікамі ўзьнят.

Хай крочыць край,
Хай дні імчацца...
Гудзі, варштат,
Сьпявай з уздымкам!
І мы з табой шліфуем частку
Пяцігадовага будынку.

Трактарная калёна

Ледзь туман толькі
ветрык разгоніць
І агнём
загарыцца зара,—
З гучнай песьняй
сталёвыя коні
Выяжджаюць
у поле араць.
Грамадою—
вясёлай калёнай,
Разгарэўшыся
ў творчым агні,
Яны мчацца
са сьвістам і звонам
У змаганьне
за лепшыя дні.
І стракочуць
шумліва маторы
На шырокім
бязьмежжы палёў.
Чуцен звон
над пахучым прасторам
Льлюцца песьні
над сьвежай ральлёй.

Спрытна рэжуць
сьцьвярдзелую залеж
І блішчаць
серабром скібы.
Усьміхаюцца
сінія далі
Над прасторамі
мяккай зямлі.
І тращчаць
трактары гучным басам,
Быльняговыя
межы сякуць.
Гэта заклік
сялян у колгасы,
Гэта лепшы
адказ кулаку.
Хай гучней
засьпяваюць маторы
На шырокіх
колгасных палёх!
Мы штодзённа
змагаемся й творым,
Да далейшых
ідзем перамог!

Я. Тупіца.

БУДАЎНІЧЫ МАЙ

Грымі барабан,
Сей хады
нашай тахт.
Хай грукі
Над брукам уюцца.
Мы сьцяг узьнялі
Будаўнічых атак
Запалам
жывых рэволюцый!!
І трубамі фабрык
Мы новых расьцем
і рост наш
Ніколі ня стане:

Мы шчасьце
і волю
Сусьвету нясем—
Пагібель
для белага стану!
Трывога, гудзі!
Гарады абымай!
Шчацінь
Барыкады ў кварталах!
Цябе будаўнічы,
Паўстанчаскі Май
Я з песьняй
і сонцам вітаю.

М. Сьцельмашук, Горкі.

На новых шляхох

Да юбілею БДВТ

Беларускі вандроўны тэатр, юбілей якога спаўняецца сёньня, распачаў сваю працу ў 1920 годзе на тэрыторыі Савецкае Беларусі. Асноўная мэта тэатру—абслугоўваньне рабочых цэнтраў і ваколіц г. Менску. Пастаноўкі тэатру адбываліся на фабрыках Ляхаўкі, Камароўкі, чыгунцы і карысталіся вялікім посьпехам.

На одны артысты рэспублікі, дырэктар БДВТ тав. Галубок У. Я.

З кожным годам праца тэатру шырылася. Калі ў 1921 г. было 176 паказаў, дык у 1924 г.—228. Да 1925 г. тэатр быў на гаспадарчым разрахунку і, не глядзячы на дрэннае матар'яльнае становішча, дзейнасьці сваёй ня спыняў.

У 1925 годзе тэатр выяжджае ў вялікае падарожжа па абслугоўваньню Барысаўскай і Мазырскай акруг, і з добрымі вынікамі вьвяртаецца назад.

На працягу некалькіх месяцаў тэатр працуе на вёсцы, фабрыках Барысава, Мазыра і інш. З гэтага часу тэатр увесь час на калёсах.

За адданую працу тэатру надазена назва: Беларускі Дзяржаўны Вандроўны Тэатр. Пераяжджаючы з акругі ў акругу, абслугоўваючы фабрыкі, заводы, Чырвоную армію, тэатр набывае сярод шырокіх працоўных мас БССР вялізарную популярнасьць.

Асабліва каштоўна праца тэатру на фронце соцыялістычнай рэконструкцыі вёскі. У 1930 г. БДВТ накіроўваецца ў колгасы Віцебшчыны і Магілёўшчыны і ставіць шматлікія спэктаклі і концэрты для колгаснага насельніцтва трох акруг. Тэатрам было абслужана 26 колгасаў,—30.000 гледачоў. Тысячы вёрст на конях, а часам і пешам, перацягваючы самастужам багаж і дэкорацыі... Тэатр працуе па-ўдарнаму. Мае моцны асяродак старэйшых працаўнікоў, як т. т.: Бусел, Згіроўскі, Ванген, Дзядзюшка, Сакалоўскі, Вазьнясенскі Лазарчык, Качанская.

Калі зрабіць глыбокі агляд працы тэатру за 10 год, дык неабходна аднатаваць, што у разьвіцьці яго было два пэрыоды. Пэрыод першы—ад часу яго організацыі рэконструкцыйнага пэрыоду г. з да 1929 г.; пэрыод другі—ад 192 году да нашых дзён.

Першы пэрыод у працы тэат характарызаваўся тым, што дзе насьць яго ня была накіравана належны бок і вельмі часта рэпэ туар тэатру не зьяўляўся ідэол гічна вытрыманым, не адбіваў гра дыёзнага будаўніцтва савецкае кр іны, ня выхоўваў рабочага гледач гледача—селяніна, не заклікаў д актыўнай барацьбы з рэшткамі к піталізму ў нашай краіне і г. Тэатр тагды быў мала вопытны вельмі часта, шукаючы праўдзів пуціны для таго, каб аддаца сл жыць дыктатуры пролетарыят зьбіваўся са шляху, але інсты ктыўна, чуючы пад сабой ня ту глебу, упарта шукаў праўдзів дарогі, і яе знаходзіў. Пад гэть трэба разумець не адпавядаючы а ноўным задачам пролетарскага т атру рэпэртутар і слабое рэагавань тэатру на запросы шырокіх м гледачоў у перабудове працы т атру.

З дапамогаю савецкай грама касьці БДВТ зьмяняе напрамак сваёй рабоце. З 1929 г. тэатр р шуча аднаўляе свой рэпэртуа уводзячы п'есы пра колектывіз цыю: „Ярасьць", „Дыктатура „Гальштук". Максымум увагі ад пытаньням набліжэньня рэпэртуа да задач сёньняшняга дня, каб с месными сіламі працаўнікоў тэатр актораў і глядачоў, пад кіраўні твам комуністычнае партыі, укл чаўся ў рады актыўных барацьб тоў на культурным фронце, фронце соцыялістычнай рэконстру цыі нашай краіны. Пад гэтым сь ідзе наша далейшая праца.

Галубок.

Шлях Марыны.

Юрка Рудзько

У хаце тлумна ад дыму цыгарачнага. Шызыя кучаравыя хмаркі плывуць пад столь. Блішчыць мядзяная, хлыпаючы ад духаты, газоўка. Разам з клубам марознага павэтра хата праглынае чалавека, запарушанага калючымі іголкамі марозу. Не хапае ўслонаў. Людзі стаяць, згрудзіўшыся. Бліжэй праціскаюцца да стала.

Бурліць гаворка.

Недзе ў кутку звонка малады сьмех рассыпаўся.

— Ну, мужчыны, годзі!—старшыня сельсавету Бурс залапацеў элоўкам аб стол.—Сход лічу адчыненым...

Гаворка, гул галасоў паволі згасаў.

— Сёньня ў нас адно пытаньне—аб пераходзе... жанкі, уважлівей!... пераходзе да колектыўнае працы. Організацыя колгасу...

— Слова мае рабочы лесазаводу—тав. Куш.

Завітала цішыня.

Крылатыя словы ляцелі над галовамі. Будзілі думкі...

— ... Нам з бядацкага становішча ня выйсьці. Ня ўзьняць гасдадаркі... Раздрабленьне—шлях да жабрацтва. Адзіная пуцявіна нам колектыўная праца...

Машына—дапамога чалавеку. Толькі організуючы колгас бядняк выйдзе з кулацкай кабалы... Ліквідуючы кулацтва як к...

— У нас таварыш, кулакоў няма.—кінуў Сьцяпан, хаваючы злосную ўхмылку ў калматую рудую бараду.

— Ага, нечага...

— Няма...

— Ёсьць кулаччо!—звонка выкрыкнула Марына, заглушыўшы грамаду. І раптам сама спужалася голасу свайго, цішыні.

Злосна загарэліся ў кутку нечыя вочы.

— Больш організавана, па чарзе кажэце,—супыніў Бурс. Але яго голас захлынуўся хваляй гаворкі.

— Мужчыны,—зьмяў раптам гаворку голас Сьцяпана,—паслухайце!...

Твару яго ня відаць было ў цёмным кутку, толькі глуха біўся голас.

— Чаму вось яны рабочыя нам прыклад не пакажуць, самі ня робяць... Толькі словамі... дурняў шукаюць... Самі, дык у камісары лезуць —партмаксымумы, камандыровачкі,—ведаю я. А мужыка-дурня у хамут. Не жадаем колгасаў, самі з вусамі, ведаем,—душыўся словамі, брызгаў сьлінай Сьцяпан. Рудая барада мачалам целяпалася ў паветры.

— Я скажу,—выйшаў Кірыла ў падзерханым, абвіслым лахманамі кажусе, падпяразаны ашматкамі вяроўкі.

— Як казаў папярэдні аратар... Да...

Нехта пырснуў сьмехам.

— Завёў, арацель...

Кірыла працягваў.

— Канешне, мо' справа і добрая—калектыў... Але мне давай зараз адзежу, абужу кармі... Што патрэбна Тады пайду, а то казаў гэты таварыш —рабіць меце і мецьмеце... А мо' і ня вырабім? Ты мне зараз дай—. тады пайду..- Ад дабра не адмовімся.. Да.

Кірыла выцер буйны, што гарох, пот на носе крысой кажуха і хуценька пабег да дзьвярэй.

— Кірыла, куды ты, хіба ўс...

Зарагаталі.

Далятаті урыўкі гаворкі.

—Ото-ж...

— Ня пойдам... Рабіць на некага...

— Жылі дагэтуль і далей ня горш..

— Самі...

Марына стаяла ла вакна ў грамадзе жонак. Шматгалосьсе рвала паветра.

Раптам усплыў малюнак.

Марына здрыганулася. Гукнула на ўсю хату:

— Слухайце. я скажу!..

* * *

Быў 1920 г. Паласавалі сьпіну маладой краіны. Палыхалі вёскі. Сьвістаў польскі бізун. Хлопцы ішлі ў лес сілу зьбіралі. Адступалі палякі.

Адкатваліся чорнай хваляй.

Усьцілалі трупамі, паходняй пажараў асьвятлялі шлях.

Прышлі ў вёску.

Рабавалі. Цягнулі апошняе з хлява і хаты. Гвалтавалі п'яныя жандары, згубіўшы чалавечы выгляд. Дзікім зьверам піло кроў войска пана Пілсудзкага...

Памятае Марына.

Сагналі ўсіх на плошчу да валасьці Вышаў афіцэр. Ляскаў бізуном па бліскучым боце.

— А, прышло быдло.. Бальшавікоў выдаць проша...

Нема маўчалі,

— Прэндко. Кто бальшавік?

Выйшаў ціхутка з грамады Сьцяпан Лісам падпоўз. Пісульку падаў.

— Ото добжэ!...

Сьвіснуў.

Грамаду зажалі колцам жандары.

Афіцэр прачытаў прозьвішчы.

Выйшлі восьмера хлопцаў панура. Не пасьпелі ў лес уцякці. Выдаў Сьцяпан. Выняў наган афіцэр. Губы скрывіла ўсьмешка.

Упалі падкошанымі ля ганку...

Жудасныя крыкі ўскалыхнулі вёску. Кінуліся жанкі да забітых.

Застылыя вочы, поўныя помсты, ня бачачы глядзелі ў блакіт...

— І мужа яе—Пятруся—тады...

Пятруся... Удавой засталася Марына гараваць...

Загубіўся ў гадох гэты кавалак жыцьця. Зараз усплыў, загарэўся, Забалелі гостра старыя раны.

* * *

Марына падышла да стала.

— Запамяталі, як Сьцяпан палякам нашых хлапцоў выдаваў?... Цераз яго забілі...

Зараз слухаеце. Добра кажа ён?... Га?..

Словы звонка ляцелі. Білі помстай.

— Хоча ён, каб і далей гнулі сьпіну яму... Чакае палякаў... Нам адна пуцявіна — згуртавацца колектывам. Іншай дарогі бедняком няма...

Пішэце мяне першай у колгас...

— Верна кажа.

— Сволач, на свой бок цягне, думаў паслухаем...

— Марына добра ка...

Сьцяпан наважыўся неўзаметкі в сьлізнуць за дзьверы.

— А, гад, паўзеш?!. Не, хадзі сюды!..

Чыясьці рука схапіла яго за каўнер і выпхнула да стала. Воўчымі вачыма блішчэў Сьцяпан. Захутаўся глыбей у кажух.

— У, свалата... маць... папаўся...

— Выслаць гада...

Выслаць... Прасіць, каб за межы Беларусі...

— Пішэце мяне ў колгас, падышоў да стала Лявон, дэмобілізаваны чырвонаармеец.

— І мяне пішэце...

— І мяне...

— Мяне...

... Пакажам сволаце...

Колгас аб'яднаў 60 гаспадарак.

Колгас „Пераможца" заканчваў сяўбу. Глыбокая чорная пахаць пахка ўздыхала. Тухкатаньнем абуджаў стынь раніцы трактар. Бліскучыя бляжкі ўядаліся ў шэрань палеткаў, адкройвалі чорныя скібы.

Зрэзалі ўперак загоны.

Гаспадарылі ў полі сяўнікі.

На водшыбе ад вёскі блішчэлі жаўцізною бярвеньні. Пеніліся кучаравыя істружкі. Будавалі абору на дзьве сотні галоў. Наперна, суладна кіпела праца колектыву.

Увечары быў партыйны сход.

Былая Сьцяпанава хата—клюб колгаскі, біў лёзунгамі.

Са сьценкі глядзеў праменістымі вачыма, цёпла ўсьміхаўся Ільліч.

Апошнім пытаньнем было—прыём у КП(б)Б. Лепшыя ўдарнікі—колгасьнікі сёньня ішлі ў партыю.

Марына ўважліва слухала прамоўцаў.

Твар заліты чырванню пакаваў не хвалявацца.

Ці прымуць?—думала.

Нарэшце дачакалася.

Сэкратар аб'явіў заяву Марыны.

— Прыняць...

— Пра Марыну і казаць нечага...

І не чакаючы запрашэньня ўсе паднялі рукі.

— Ітак сход аднагалосна прымае сябрам...

Бурлівыя воплескі захлынулі словы сэкратара.

Вырываліся з хаты пераможна.

2—III-31 г. Колгас „Прамень Комуны".

ДАЦЬ ГАРУЧАЕ І ЗМАЗКУ ТРАКТАРАМ

У БССР у гэтым годзе буд працаваць 30 МТС, з іх новых—2 Старыя трактары атрамантаваны, запасныя часткі атрыманы. Я бачым, усё абстаіць добра. А гэта толькі так здаецца, сапраўд зусім на так. У паўднёвых раёна распачалася сяўба, праз 3-4 дні ў БССР пачне сеяць. Але большасьць МТС не забясьпечана гаручым і змазачным матар'ялам.

Клімавіцкая, Лёзьнянская, Сіроцінская, Горацкая МТС ня змогуць выйсьці ў поле таму, што няма ў аднаго кілё газы і змазкі.

Белкоопсаюз павінен быў забяспечыць МТС гаручым. Але ў Белкоопсаюзе не праяўлена опэртыўнасьці стаўка на самацёк. Адказныя Са юзнафты таксама нічога не зрабілі для забясьпячэньня МТС гаручым. Такой безадказнасьці павінен быць пакладзены канец.

Гаручае і змазка для трактароў павінны быць неадкладна дастаўлены.

Логвін

17 колгасьнікаў—вынік прапрацоўкі рашэньняў зьезду

Лёзна. У выніку прапрацоўкі дакладу наркамзема—т. Якаўлева аб колгасным будаўніцтве на сумесным сходзе комунараў комуны „Прогрэс" аднаасобнікаў, 17 беднякоў і серадня коў падалі заявы ў колгас і на гэ ты-ж сходзе былі прыняты. Сход комунараў і аднаасобнікаў ухвалі рашэньні VI-га зьезду аб колгасным будаўніцтве. Усе ўдзельнікі сходу абавязаліся быць мобілізаванымі на пасяўную праведзеньні іх у жыцьцё.

Н. Кароль

З пасеўнага фронту

Укараніўшы зьдзельшчыну, ліквідаваўшы абязьлічку,—падвоім тэмпы сяўбы

Кожны колгасьнік і колгасьніца павінны ведаць аб тым, якую норму прыдзецца выпрацаваць, дзе і што рабіць, колькі працадзён, за якую колькасьць і якасьць работы ім будзе залічана

Тэрмін выкананьня асноўных работ па сяўбе сёлета значна скарочаны, што патрабуе максымальна напружаных тэмпаў, дакладнай расстаноўкі сродкаў вытворчасьці і сіл. Трэба сваячасова і цалкам выканаць пляны, стварыць насенныя, фуражныя і страхавыя фонды.

Укараненьне ў колгасах зьдзельшчыны, ацэненай у працаднёх, ліквідацыя абязьлічкі—вось парука ўдарных тэмпаў сяўбы.

Апошні тэрмін для пераводу ўсіх колгасаў на зьдзельшчыну, паводле дырэктыў партыі і ўраду, канчаецца 5 мая. Усё-ж весткі з Слуцку, дзе з 80 колгасаў толькі 25 пераведзены на зьдзельшчыну, з Уладзімерскага сельсавету (Клічаўскі раён) дзе з 8 колгасаў ніводзін не пераведзен на зьдзельшчыну і не ліквідавана абязьлічка, сьведчаць аб тым, што падрыхтоўка да сяўбы у гэтых раёнах нездавальняюча, што ў гэтых раёнах не забясьпечаны сапраўды бальшавіцкія тэмпы.

Мы ўступаем у масавы сеў па ўсёй рэспубліцы. Комсамольскім ячэйкам неабходна зараз-жа:

Перабудаваць усю сваю работу на опэрацыйныя рэйкі, у найкарацейшы тэрмін скончыць усю зьвязаную з падрыхтоўкай працу і ўключыцца ва ўдарнае правядзеньне сяўбы.

Забясьпечыць пераход ўсіх колгасаў на зьдзельшчыну і ліквідаваць абязьлічку да устаноўленага ўрадам тэрміну.

Узяць бальшавіцкія тэмпы ў організацыі новага колгаснага прыбою, забясьпечыўшы за час вясеньняга севу ня менш 30 проц. колектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Ніводзін колгас не пераведзены на зьдзельшчыну

КЛІЧАЎ. Ва Уладзімерскім сельсавеце 8 колгасаў, большасьць якіх нядаўна організавана.

Да выхаду ў поле засталіся лічаныя дні, але ніводзін колгас не перавёў працу на зьдзельшчыну. Працоўная сіла не расстаўлена, абязьлічка не ліквідавана.

Комсамольская ячэйка не праводзіць у жыцьцё рашэньня 6 зьезду саветаў.

Пост „Ч. З." С. Стальны

Пачалася сяўба. Комсамольцы ў першых радох

СТАРЫЯ ДАРОГІ. 29 красавіка Колгасы „Расьсьвет новага жыцьця", „Соцыялізм", „10 год Кастрычніка" пасеялі ўжо яравое жыта і пачынаюць сеяць бульбу. Астатнія колгасы выйдуць у поле пасьля 1-га мая.

Комсамольцы-колгасьнікі ў сяўбе паказваюць сябе перадавымі.

Брыгада „Ч.З." А. У. Ш. У.

Гураганным агнём па опортуністычнай практыцы

У найкарацейшы тэрмін скончыць падрыхтоўку да сяўбы

Вула. Вобальскі с-с ня ўзяў баявыя тэмпы ў падрыхтоўцы да сяўбы. Сельсавет ганебна адстае ў тэмпах колектывізацыі. Колектывізавана толькі 8,7 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

На 20 красавіка на аднаасобным сэктары агульны пасеўплян даведзены да паасобных двароў толькі на 51 проц., а плян лёну—на 36 пр., бульбы—49 проц., кармовых траў—на 19 проц.

Ачыстка насеньня праходзіць марудна. Збожжа ачышчана 40 пр. пляну. Плян кантрактацыі і загатоўкі малака выкананы на 7 проц.

Райколгассаюз не дапамагае і ня кіруе працай колгасаў. Перавод колгасаў на зьдзельшчыну і ліквідацыя абязьлічкі праходзіць самацёкам.

Партыйныя ячэйкі, якіх у с-с 3, а таксама 5 комсамольскіх ячэек не змагаюцца за хутчэйшы перавод колгасаў на зьдзельшчыну і выкананьне пляну пасеўкампаніі.

Райком партыі павінен ударыць па опортуністычнай практыцы с-с, партыйных і комсамольскіх ячэек.

Брыгадзір „Ч. З." Шэдзько.

Дырэктыва партыі аб колектывізацыі 30 проц. да сяўбы—выканана

Абвясьцілі ўдарны месячнік сяўбы

ПРАПОЙСК (па тэлефону). Рапартуем, што заданьне партыі аб колектывізацыі 30 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак за час вясеньняй сяўбы—выканана. Раён колектывізаваны ўжо на 35,5 проц.

Па ініцыятыве раду комсамольскіх ячэек організаваны колгасы. Целешаўская ячэйка організавала колгас імя 9-га зьезду УсеЛКСМ. Сэкратар ячэйкі абраны старшынёю колгасу.

У раёне разгортваецца масавая сяўба. Май месяц абвешчаны ўдарным месяцам сяўбы.

Сэкратар РК ЛКСМБ Каган

Случчына затрымлівае пераход на зьдзельшчыну

Выкарыстаць практыку колгасу „Комбайн"

На Случчыне з 80-ці колгасаў пераведзены на зьдзельшчыну толькі 25. Прычына—адсутнасьць масавай працы сярод колгасьнікаў. Райколгассаюз бязьдзейнічае.

Колгасы „Комбайн", „Селянін", „Комінтэрн", „Прогрэс", і „Случ"- першымі ў раёне перашлі на зьдзельшчыну, ацэненую ў працаднёх. У аснову ўзяты нормы выпрацоўкі колгасьнікаў—ударнікаў.

Вось конкрэтныя паказчыкі норм выпрацоўкі колгасу „Комбайн":

Жывёлагадоўля

Догляд за 15-цю каровамі з загатоўкай і дастаўкай з базы корму аднесена да групы цяжкіх; аднаму рабочаму залічваецца 1,25 працадзён.

Дойка 10-ці кароў тры разы ў суткі, у сярэднім па 5 літраў малака ад кожнай, аднесена да цяжкай працы; залічваецца 1,25 працадзён. Пасьвіць 30 штук жывёлы лічыцца сярэдняй работай: залічваецца 1 працадзень.

Паляводзтва і лугаводзтва

Узорка аднаконным плугам 0,6 га адносіцца да групы работ сярэдняй цяжкасьці і колгасьніку залічваецца 1 працадзён. За ўзорку параконным плугам 0,75 га—1 працадзень аднаму чалавеку.

Баранаваньне бараной „зыгзаг" у адзін сьлед 4,5 га: 1 працадзень.

За вывазку 8 возоў гною на адлегласьць 1 кілёметра аднаму чалавеку залічваецца 1,25 працадня.

Уборка пры дапамозе жняяркі 2,5 га дае 1,5 працадня, бо праца гэта лічыцца кваліфікаванай. Неабходна адзначыць, што леташняй вясною да ўвядзеньня зьдзельшчыны ў „Комбайне", за 10-ці гадзінны рабочы дзень аратыя на параконных плугах узорвалі 0,5 га, а пасьля ўвядзеньня зьдзельшчыны, увосень, яны ўзорвалі 0,8 га.

Колгасьнікі пераканаліся ў неабходнасьці правільнай організацыі працы і пераходзе на зьдзельшчыну, як у сродку гаспадарчага і політычнага замацаваньня колгасу.

Райколгассаюз, партыйна-комсамольскія організацыі павінны зараз-жа да выхаду у поле скончыць перавод усіх колгасаў на зьдзельшчыну ацэненую ў працаднёх і гэтым забясьпечыць ударныя тэмпы у правядзеньні вясеньняй сяўбы,

Брыгадзір „Ч. З."
Янка Прыбытак

Крочаць да суцэльнай

Боркавічы. Фронт колектывізацыі з кожным днём пашыраецца. Сельсаветы падыходзяць да суцэльнай колектывізацыі. Замшанскі с.-савет, дзякуючы праведзенай шырокай політычна-масавай рабоце сярод бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, дасягнуў 70 проц. колектывізацыі.

Новыя колгасы замацаваны і падрыхтаваны да сяўбы. Абагулена насеньне, інвэнтар і цяглавая сіла. Выпрацаваны і прыняты вытворчыя і працоўныя пляны. Уся праца праводзіцца на зьдзельшчыне, ліквідуюць абязьлічку.

Ударная юнкораўская брыгада „Ч. З." Барчук, Брыль, Спапок і Пулькоў

Ня спыняцца на дасягнутым

Плешчаніцы. (Па тэлефону ад нашага корэспондэнта). Колгас „Чырвоны Кастрычнік", Каменскага с-с., поўнасьцю падрыхтаваўся да вясеньняй сяўбы. Насенныя, фуражныя і страхавыя фонды складзены. Рамонт машын, інвэнтара скончаны. Рабочая сіла расстаўлена. Уся праца пераведзена на зьдзельшчыну, ацэненую ў працаднёх. Ліквідавана абязьлічка. Кожная пара коняй і інвэнтар прымацаваны да колгасьнікаў.

Колгас організаваў адно т-ва сумеснай апрацоўкі зямлі, у якое ўлілося 13 гаспадарак. Комсамольская ячэйка зьяўляецца актыўным агітатарам за гэтыя бальшавіцкія тэмпы.

А. Заслаўскі.

Выходзьце насустрач лесасплаву

Плыты павінны гнаць ударныя брыгады плытагонаў

Пастанова ЦК ЛКСМБ павінна быць выканана

Даць 500 комсамольцаў-ударнікаў сплаву

Сплаў пачаўся. Калі 27 красавіка мы адзначалі, што драўніну сплаўляе толькі Мазырская кантора, дык сёньня сплаў праводзяць ужо Мазырская, Бабруйская, Гомельская сплаўныя канторы. На Віцебшчыне з-за вялікага разьліву сплаўных рэк, сплаў яшчэ не распачаўся. Гэты час скарыстоўваюць для вязкі плытоў.

З намечаных па пляну 2447 тысяч куба-мэтраў драўніны, якая павінна быць падвезена да сплаўных пунктаў, к 1-га мая падвезена 2145 тысяч к-м.

Спушчана на ваду 153000 к-м. У сплаву—152 тыс. к-м у дарозе—152 тыс. прыбыла к заводам 1000 к-м, здадзена спажыўцам—99 тыс. к-м.

Забясьпечаньне рабочай сілай патрэб сплаву пасунулася наперад у параўнаньні з становішчам на 27-IV. З патрэбных для веснавога сплаву 28925 рабочых працуе 19347 чал. Дзь інскі экспортны сплаў цалком забясьпечаны рабсілай.

Неабходна ўзмацніць вярбоўку рабочых. бо тэмпы вярбоўкі невыстарчальны. За апошнюю дэкаду завербавана прыблізна каля 1000 чал. Улічыўшы. што для патрэб сплаву неабходна 40 тыс. рабочых, трэба яшчэ больш разгарнуць вярбоўку раб сілы з тым, каб забясьпечыць поўнасьцю ня толькі вясновы сплаў.

Асабліва востра паўстае пытаньне рацыянальнага, найбольш продукцыйнага скарыстаньня рабочай сілы. Адна з форм падвышэньня вытворчасьці працы рабочага сплаушчыка — брыгадны мэтод працы.

Па апошніх тэлеграфных вестках, на Віцебскім сплаве дзе працуюць 3974 чал. організавана 63 брыгады з 1165 рабочых. Значэньне брыгаднага мэтоду працы тут зразумелі і пайшлі па правільным шляху.

З Мазырскай, Бабруйскай і Гомельскай сплаўных кантор няма ніякіх зьвестак аб організацыі брыгад. Значыць, у гэтых канторах рацыянальнай організацыяй працы не займаюцца.

Брыгадны мэтод працы дае магчымасьць максымальна разгарнуць ва ўсёй масе рабочых лесасплаву соцспаборніцтва і ўдарніцтва, а гэта—адзін з рашаючых момантаў выкананьня сплаву.

Выкананьне пастаноў ЦК ЛКСМБ аб мобілізацыі 500 комсамольцаў на сплаў, якія павінны будуць даць прыклад і забясьпечыць ударныя тэмпы ў выкананьні програмы лесасплаву, разгортваньні соцспаборніцтва і ўдарніцтва", праводзіцца зусім дрэнна. Пакуль мобілізаваны толькі адзінкі. Па вестках з раёнаў, раённыя комсамольскія організацыі ў пунктах сплаву не аддаюць належнай увагі выкананьню пастановы ЦК.

500 комсамольцаў—ударнікаў сплаву. організатараў соцспаборніцтва, павінны ў самы кароткі тэрмін быць на сплаве.

Пастанова ЦК павінна быць выканана.

Організацыя на буйных сплаўных пунктах комсамольскіх ячэек павінна стаць справай сёньняшняга дня.

У Барысаве дрэнна рыхтуюцца

Барысаў. 30. (Па тэлефону ад нашага юнкора). Рака ачысьцілася ад лёду, а Барысаўскі Леспрамгас падрыхтаваны да сплаву назвычайна дрэнна, пляны яшчэ не даведзены да вучасткаў.

Рабочай сілы не выстарчае. З патрэбных 2000 чал. зараз працуе толькі 700.

Да сплаўных прыстаняй вывезена 67,7 проц. загатоўленых дроў і 36,9 проц. лесу.

Зусім не падрыхтованы сплаўны інвэнтар: якары, сплаўныя лодкі і інш. Занятыя на сплаве рабочыя не забясьпечваюцца таварамі. Крамы не адчынены. Няма масавай выхаваўчай работы з плытагонамі.

Усё гэта ставіць пад пагрозу выкананьне програм лесасплаву.

Так програма ў 500 тыс, кубамэтраў лесу ня можа быць выканана.

Неабходна рашуча ўзмацніць працу Барысаўскага леспрамгасу.

Г. Кугель

Вынікі паводкі не павінны затрымаць сплаву

У зьвязку з нязвычайнай ва ўмовах Беларусі паводкай, перад сплаўнай сыстэмай Беларусі стаяла вялікая і адказная задача: утрымаць усю падрыхтаваную да сплаву драўніну, каб паводка не затрымала сплаву.

Весткі атрыманыя па тэлефону са сплаўных пунктаў у час паводкі, сьведчаць аб тым, што на мясцох з гэтай задачай справіліся. Зьнесеная драўніна амаль уся злоўлена на затрымных пунктах.

З Полацку паведамлялі, што разносу драўніны ня было. У Беркавічах, Бешанковічах зьнесеную драўніну вылавілі.

У Воршы з прыстані Чачары сарвала 80 кбм. дрэва, 60 кбм. злоўлена.

У Чэрыкаве пад'ёмныя і скатныя прыстані ад паводкі захаваны.

У Клімавічах сарвана Клічаўская прыстань. Зьнясло 700 мтр. бачкаркі, 100 шпальных чурбаноў. Драўніна ўся паймана.

Амаль усе леспрамгасы сустрэлі паводку падрыхтаванымі. Драўніна была замацавана. У выніку разнос дрэва зусім нязначны. Вынікі паводкі на сплаве не адаб'юцца.

З 4 да 60

Горкі. Ячэйка КСМ, Горскага с-савету, разгарнула шырокую масава-растлумачальную работу сярод колгасьнікаў і аднаасобнікаў вакол рашэньняў УІ-га ўсесаюзнага зьезду саветаў.

За час падрыхтоўкі да сяўбы організавана 6 новых колгасаў. Процант колектывізацыі па с-с. узрос з 4 да 60 проц. Вядзецца далейшая напружаная работа па скančэньню суцэльнай колектывізацыі і на яе аснове ліквідацыі кулацтва як клясы. Комсамольскай організацыяй разгорнута вялікая работа па замацаваньню новаорганізаваных колгасаў, пераводу іх на зьдзельшчыну, абагуленьню цяглавай сілы і ўкараненьню ў працы соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

Пуд.

Змагацца за найкарацейшы тэрмін сяўбы

Грэск. Палікарпаўскі с-савет быў летась колектывізаваны толькі на 3 проц. Бальшавіцкая падрыхтоўка да вясеньняй сяўбы, масавая работа сярод сялянства, разгорнутая комсамольскай ячэйкай, выклікалі новую хвалю колектывізацыі.

На 1-1—г. г. с-савет быў колектывізаваны на 35 проц., а 10-IУ—г. г. 72 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак улілося ў колгасы.

Вёскі Адамова, Апаліна і Палікарпаўка цалкам уступілі ў колгас

Як старыя так і новыя колгасы падрыхтаваліся да выхаду ў поле.

Брыгадзір „Ч. З."—Я. Дымаў і Я. Рачны.

ПЕРАБУДОВУ ПІОНЭРОРГАНІЗАЦЫІ— НА УДАРНЫЯ РЭЙКІ

Прыцягнуць усю пролетарскую грамадзкасьць да пераўкомплектаваньня піонэрскіх радоў

Слабасьць нашай работы скарыстаў вораг

Барысаўская піонэр-арганізацыя знаходзіцца зараз у выключна цяжкім становішчы. Большасьць атрадаў ужо 2—3 месяцы як не працуюць. Атрады, якія нешта робяць, абмяжоўваюцца ў лепшым выпадку зборам попелу. Большасьць вясковых атрадаў не ісьнуюць—разваленых.

Дагавор піонэр-арганізацыі з Наркамземам і ВСНГ Барысаўскай піонэрскай арганізацыяй не працаваны і не даведзены да піонэрскіх мас.

Вытворчыя базы піонэраў пры буйнейшых вытворчых колектывах (завод „Домбаль", ф-ка „Бярэзіна") працуюць без павадыроў, якіх няма і ва ўсіх астатніх атрадах, за выключэньнем базы пры заводзе „Комінтэрн" і аднаго вясковага атраду ў вёсцы Меча.

З 15-ці школ гораду не прымацаваны да вытворчасьці 4. У вясковых школах няма павадыроў-фарпастоў. У Лошыцкай сямігодцы павадыр фарпосту адначасова зьяўляецца і сакратаром ячэйкі ЛКСМБ і павадыром атраду. Дзеля гэтага фарпост у школе не працуе.

Не так даўно на Барысаўшчыне былі выкрыты дзьве дзіцячых контр-рэволюцыйных арганізацыі, якія накіроўвалі сваю дзейнасьць на падпал колгасаў, на зрыў колектывізацыі, аднак ні піонэр-организацыя, ні Райком ЛКСМБ на гэта не зьвярнулі належнай увагі, ні выкарысталі гэтых фактаў для выхаваньня дзіцячых мас у класавым духу.

У Глівенскай школе старшыню Райбюро тав. Каждан вучні сустрэлі крыкамі „вон, жыдоўка", але і гэтага нагляднага выпадку адкрытага антысемітызму ні комсамольская, ні піонэрская арганізацыі не выкрылі.

Райбюро ДКО займалася частымі паседжаньнямі, а практычная праца організацыі з кожнай гадзінай занепадала.

Зараз надзвычайна цяжка праводзіць пераўкомплектаваньне Барысаўскай піонэрорганізацыі, бо яна напалову развалена. Аднак, за апошнія дні праведзены наступныя мерапрыемствы. Гэта пытаньне прапрацавана на нарадах сакратароў яч. КСМ, павадыроў атрадаў, піонэраў-комсамольцаў, на конферэнцыі настаўнікаў, было таксама пастаўлена і на прэзыдыуме Райпрофсавету.

Рад колектываў ЛКСМБ ужо практычна праводзіць пераўкомплектаваньне атрадаў, але ў самых атрадах гэтая справа пасоўваецца слаба.

Рубенчык.

Вопыт пераўкомплектаваньня 5-ці баз на стаў набыткам усёй піонэрорганізацыі

Праведзенае загадзя арганізацыйнае пераўкомплектаваньне 5 піонэр - баз гор. Бабруйску дало багатыя вынікі. Але вакол яго ня былі мобілізаваны масы рабочых прадпрыемстваў, гаспадарнікі, прафсаюзныя организацыі. Ня была створана грамадзкая думка.

Пераўкомплектаваныя базы няпоўнасьцю забясьпечаны павадырамі атрадаў і аслабаненымі павадырамі баз.

Вопыт пераўкомплектаваньня гэтых баз не перанесен у астатнія гарадзкія піонэрскія атрады.

Праводзячы орг. пераўкомплектаваньне астатніх піонэр атрадаў Бабруйску, зьвернута ўвага на гэтыя недахопы з тым, каб іх не паўтараць.

Шырока разгорнута растлумачальная работа сярод рабочых, настаўнікаў, піонэраў і вучняў.

У падрыхтоўчай растлумачальнай рабоце выявілася, што некаторыя актывісты няправільна ацэньваюць ролю і значэньне пераўкомплектаваньня піонэр-організацыі і неабходнасьць узмацненьня кіраўніцтва з боку КСМ.

Некаторыя комсамольцы падтрымлівалі зусім памылковыя погляды аб тым, што „гаспадарнікі ня змогуць прыняць удзел у пераўкомплектаваньні піонэр-организацыі, што ўключаць іх у гэту работу нельга, што ўсё роўна яны ня будуць працаваць, бо загружаны на прадпрыемстве; што нельга з прадпрыемства браць рабочых комсамольцаў-комуністых на сталую піонэр-работу павадырамі баз, бо гэта сарве прамфінплян, што прадпрыемствам трэба ўзмоцніць кадрамі, а не пасаблять, што лепш за ўсё на гэту работу браць служачых і тых комсамольцаў, якія зараз беспрацоўныя".

Гэтыя зусім памылковыя погляды зьяўляюцца шкоднымі, опортуністычнымі. Таварышы, якія іх падтрымліваюць, зусім забываюць пра пролетарскае ядро кіраўніцтва піонэр-организацыі, зусім забываюць аб вялікім значэньні організацыйнага пераўкомплектаваньня піонэр-организацыі. Недацэньваюць далучэньне піонэрскай організацыі да вытворчасьці, узмацненьне ролі яе, як важака і организатара дзіцячых мас, у барацьбе за прамфінплян, за колгасы, за політэхнізацыю.

Правільную лінію ўзяло Бабруйскае райбюро. Яно вядзе рашучую барацьбу з усімі хваравітымі зьявішчамі і недахопамі, з усімі опортуністычнымі поглядамі на піонэрпрацу.

Шырока разгорнутая падрыхтоўчая растлумачальная праца забясьпечвае добрыя вынікі орг. пераўкомплектаваньня піонэрорганізацыі.

Ш.

Прыклад галавацянскага рэагаваньня

Патрабуем спыніць ганебную справу Ханіна і прыцягнуць вінаватых да адказнасьці

Па рознаму людзі рэагуюць на крытыку ў друку. Для прыкладу возьмем кіраўніцтва Белдзяржкіно.

„Чырвоная Зьмена" зьмясьціла нататку „Пад праменьнямі юпітэраў". Гэты допіс яскрава выкрываў эксплёатацыю і цкаваньне маладога рабочага М. Ханіна, што працаваў з 1922 году і па сёньня пасобным працаўнікі Белдзяржкіно.

Гэта справа вядзецца ўжо доўгі час, ёю займаліся многія організацыі. Але вынікаў ня было. Пасьля зьмяшчэньня ў газэце допісу, адміністрацыя БДК, амаль на заўтра-ж, здымае Ханіна з працы памочніка кіно-асьвятляльніка і пераводзіць на працу чорнарабочага з акладам пэнсіі ў 49 рублёў.

Такім чынам, першы крок да „рэагаваньня" зроблены.

Праз нейкі час Ханін быў прызваны на месячны збор у Чырвоную Армію. Аднак экспэдыцыя ленінградзкай фабрыкі Белдзяржкіно, якая прыехала ў Менск для здымкі, запатрабавала аслабаніць яго ад вайсковага збору ў сувязі з тым, што ён добра ведае справу асьвятляльніка і што ў гэтай галіне няма спэцыялістых.

З экспэдыцыяй Ханін працаваў з 6-га па 13-е красавіка.

Як скончылася работа экспэдыцыі, кіраўніцтва БДК, у асобе тав. Матусава, выносіць загад зьняць Ханіна з працы за прагул (!?)

У выніку доўгага расьсьледваньня, зьмяшчаньня матар'ялу ў друку і працы шматлікіх брыгад Ханін усё-ж такі застаўся беспрацоўным.

Мы ня можам дапусьціць такіх злачынных адносін да маладых рабочых і груба бюрократычных фактаў нерэагаваньня на крытыку ў друку.

Мы лічым, што справа з Ханіным не павінна прайсьці без усякіх вынікаў. Органы РСІ і прокуратура павінны навучыць галавацяпаў з Белдзяржкіно, як трэба рэагаваць на крытыку друку, і зьнішчаць выкрытыя недахопы.

Ханін павінен быць аднаўлены на працы ў якасьці намесьніка асьвятляльніка, з аплатай за ўвесь прагул, дапушчаны па віне кіраўніцтва Белдзяржкіно.

Б. В.

Да юбілею „Ч. З." засталося 6 дз

Комсамолія Віцебшчыны і Случчыны рапартуе юбіляру

Бярэм абавязак ліквідаваць прарыў

Рапарт

Колектыву КСМ ф-кі „Профінтэрн" (г. Віцебск)

Комсамольскі колектыў ф-кі „Профінтэрн", у ліку 170 комсамольцаў і 300 чалавек беспартыйнай моладзі, у дзень 10-цігадовага юбілею газэты „Чырвоная Зьмена" шле сваё шчырае комсамольскае вітаньне і лепшыя пажаданьні ў далейшай яе працы за выкананьне 5-цігодкі ў 4 гады.

Наш колектыў к 10-цігодзьдзю „Чырвонай Зьмены" мае наступныя дасягненьні: абвешчаны „чырвоназьменаўскі" набор у комсамол. На сёньня ў рады КСМ уцягнута 75 лепшых маладых ударнікаў. Організаваны гурткі па аўладаньню тэхнікай. У адказ на выклік тульскіх рабочых, на ф-цы організавана 3 ударных брыгады імя „518 і 1040". Да дня 2-й гадавіны соцспаборніцтва і ўдарніцтва організавана адна брыгада ў цэху паў-паліто ватыне.

Але-ж, побач з дасягненьнямі, комсамольскі колектыў ф-кі мае ў сваёй працы рад недахопаў.

На ф-цы прарыў у выкананьні прамфінпляну. За 25 дзён красавіка выканана 80,3 проц.

Комсамольскі колектыў ф-кі „Профінтэрн" бярэ на сябе абавязак у найкарацейшы тэрмін ліквідаваць запазычанасьць у выкананьні прамфінпляну, а таксама ў падпісцы на газэту „Чырвоная Зьмена."

Пад кіраўніцтвам ленінскай комуністычнай партыі комсамольскі колектыў ф-кі „Профінтэрн" выканае ўсе задачы, што перад ім стаяць.

Колектыў ф-кі „Профінтэрн".

„Кожнае дасягненьне „Чырвонкі"—мая радасьць"

Памятаю... позна... ноч... на двары завіруха. Пры газьніцы канчаю допіс. Няжо ж і шчэ доўга не бярэ сон, думаеш ці зьмесьцяць.

Рана яшчэ раз перапісваеш, каб ніхто не сьмяяўся.

Праз тыдзень зьмясьцілі. Колькі радасьці, колькі шчасьця. А далей—цэлая істужка ўпартай, напружанай працы.

На першы раз допіс зьмясьцілі, але, што будзе цяпер, калі нязвычайны допіс пішу: „Шаноўны тав. рэдактар і астатнія таварышы з рэдакцыі! На гэты раз дасылаю вам ці калачак е айго жыцьця, ці заступіцеся". А можа ліст не атрымаюць, можа дзе заваліцца. Я пісаў аб зьдзеках, якія чынілі нада мною людзі, жадаючы прытупіць друкаванае слова. Але і тут „Чырвонка" заступілася. Допіс Глезэра „да адказнасьці зацiскачоў самакрытыкі" узварушыў грамадзкасьць рабочага пасёлку. А вынік,—дырэктар за прасьледваньне зьняты, бюро партколектыву распушчана. Вось чаму кожны дасягнуты крок „Чырвонкі", кожная яе радасьць, гэта—мая радасьць. Сваім сябром па працы, змаганьню і рэдакцыйным супрацоўнікам, у сувязі з 10-ці годзьдзем змаганьня за лінію ленінскай партыі, за пабудову соцыялізму ў нашай краіне—палкае юнкораўскае прывітаньне.

Юнкор Міхась.

Баявой „Чырвонцы" ад маладых бальшавікоў—прывітаньне.

Баявой комсамольскай газэце „Чырвоная Зьмена" у дзень дзесяц гадовага юбілею ад маладых бальшавікоў Віцебшчыны—комсамольск прывітаньне.

„Чырвоная Зьмена" адыгрывае вялізарную ролю ў барацьбе комса молу за генеральную лінію партыі, у комуністычным выхаваньні пад растаючага пакаленьня, у перанясеньні вопыту работы організацыі комсамолу.

„Чырвоная Зьмена"—моцны змагар за бальшавіцкую самакрытыку мэтод работы ленінскага комсамолу.

Комсамол Віцебшчыны забясьпечыць любоў і ўвагу моцнай збро комсамолу Беларусі—„Ч. З." ў яе далейшай рабоце.

Дзярыцеся як чэрці і надалей за выкананьне баявых задач комса молу за пабудову соцыялізму ў краіне саветаў, за сусьветны Кастрыч нік.

Віцебскі гарадзкі Камітэт ЛКСМБ

Слуцак выклікае на спаборніцтва Рагачоў

Агульна-гарадзкі сход комсамолу Слуцку, юнкораў і чытачоў „Чырвонай Зьмены" сабраўшыся 25-красавіка у адзнаку 10-ці гадовага юбілею „Чырвонай Зьмене", шле палкае комсамольскае прывітаньне ЦК ЛКМБ і яго баявому органу „Чырвонай Зьмене.. „Чырвоная Зьмена" пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ рашуча змагаецца і змагалася за генэральную лінію партыі, мобілізуючы масы комсамольцаў і беспартыйнай рабочай батрацка-бядняцкай і колгаснай моладзі на ажыцьцяўленьне задач партыі аб пабудове соцыялізму ў нашай краіне, даючы заўсёды руйнуючы адпор опортуністым і шовіністым розных колераў.

Адначасова, агульна-гарадзкі сход комсамолу, юнкораў , чытачоў „Чырвонай Зьмены" у ліку 300 чалавек лічыць неабходным ўнесьці свае прапановы па палепшаньню газэты.

1. Больш асьвятляць навучальна-тэхнічныя пытаньні, піонэр-працу і комсамольскае кіраўніцтва ею.

2. Асьвятляць і передаваць вопыт культ-будаўніцтва і культ-масаву працу.

3. Больш перадаваць вопыт рабо па перабудове колгасных ячэек.

4. Патрабуем ад ЦК ЛКСМБ „Чырвонай Зьмены" павялічэньня ф мату самой газэты.

Агульны сход комсамолу Слуцк юнкоры і чытачы „Чырвонай Зьмен у знак яе юбілею бяруць на ся абавязак перавыканаць сустрэчн лічбы па выпісцы „ЧЗ" давёўшы лік п пісчыкаў з 900 да 2000 экз, Павял чыць лік юнкораўскіх брыгад з 2 да 10-ці У знак юбілею „Чырвонкі 1-га мая абвясьціць заклік беднякоў серадзнякоў—аднаасобнікаў у колгас колгасьнікаў—ва ўдарныя брыгад

Комсамольцы, юнкоры чытачы „Чы вонай Зьмены" Слуцку выклікаю на соцспаборніцтва Рагачэўскую о ганізацыю комсамолу па выпісц „Чырвонкі" і юнкораўскай працы.

„Чырвонка" будзь і надалей ве ным змагарам за генэральную лін партыі, за пабудову соцыялізму нашай краіне.

Прэзыдыум сходу

Я вырас і навучыўся працаваць пры дапамозе „Чырвонкі"

Гэта было ў 1926 годзе. Добра памятаю час, калі першы раз убачыў „Чырвоную Зьмену". З першага разу яна зацікавіла мяне, прыцягнула маю ўвагу, як прыцягвае да сябе ўсю моладзь і комсамол. З гэтага часу яна стала маім дапаможнікам у працы. Праз некаторы час я стаў пісаць у сваю газэту і ўліўся ў 1000-ую армію юнкораў „Чырвонкі". Дні ішлі,—за імі годы. Я стаў комсамольцам. Тут я і зразумеў, што кожны комсамолец, які чытае сваю газэту, павінен яе і распаўсюджваць, і я стаў першым ударнікам па распаўсюджваньню „Чырвонай Зьмены" сярод моладзі. Штомесячна я распаўсюджваў больш 250 экз. На справе я пераканаўся, што мала працаваць самому, трэба організаваць усю моладзь, каб яна ўдзельнічала ў справе колгаснага будаўніцтва. Зараз я зьяўляюся ўдарнікам „Чырвонай Зьмены". Гэта пачэснае званьне я з гонарам апраўдаю на практычнай працы. Я павінен сказац што пры дапамозе 1000-най арміі юн кораў газэта на працягу ўсяго час добра асьвятляла і асьвятляе ўдзе моладзі ў соцыялістычным будаўніц тве, даючы лепшы вопыт працы ком самольскіх колектываў і організацый моцна бічуючы адстаючых.

Газэта асьвятляе на сваіх старонка рэволюцыйны рух моладзі ў капіталі стычных краінах. Але трэба адзначыц некаторыя недахопы. На сваіх старон ках „Чырвоная Зьмена" недастатков асьвятляла пастаноўку політ-вучобы ў раённых комсамольскіх організа цыях. Недастаткова была разгорнут масавая праца з арміяй юнкораў Частка юнкораў адстае ад сучасны тэмпаў соцбудаўніцтва. Гэтыя недахопы павінны быць зьнішчаны.

У дзень 10-ці годзьдзя „Чырвонай Зьмены" перадаю сваё палкае комсамольскае прывітаньне.

А. Заолаўскі.

„Ч. З." выхавала шмат юнкораў

Да свайго 10-цігадовага юбілею „Чырвоная Зьмена" стала штодзённым дапаможнікам кожнага комсамольца, кожнага маладога рабочага і колгасьніка. Я стаў у шэрагі юнкораў у 1925 годзе. „Чырвоная Зьмена" мяне выхоўвала, давала і дае правільны напрамак у маёй штодзённай практычнай працы.

Абвяшчаю сябе ўдарнікам 10-цігадовага юбілею „Чырвонай Зьмены" і абавязваюся яшчэ з большай энэргіяй узяцца за прасоўваньне яе ў гушчы працоўнае моладзі. Няхай жыве „Чырвоная Зьмена"—стойкі змагар за генэральную лінію партыі.

Юнкор Гоман.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

5 мая, а 7 гадзіне ўвечары,

у памяшканьні рэдакцыі „ЧЗ"

адбудзецца нарада

ТЫХ, ШТО ТВОРАЦЬ ГАЗЭТУ,

каб колектыўна скласьці матар'ялы к юбілейнаму нумару аб рабоце юнкорый

У Г А З Э Ц Е.

ЗАПРАШАЮЦЦА ЎСЕ ЮНКОРЫ,

з якіх пэрсанальна:

т. т. Гельфанд, Мінкін, Эйдэльман, Крычэўскі, Крутковіч, Кугель, Баркун, Дрэйцар, Гільман.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Галоўлітбел № 599.